І. А. Прэзаў

# АСОБА Ў ГІСТОРЫІ: ВЯЛІКІ КНЯЗЬ КІЕЎСКІ УЛАДЗІМІР СВЯТАСЛАВІЧ

*Разглядаюцца асноўныя вехі жыцця і дзейнасці вялікага нязя кіеўскага Уладзіміра Святаславіча.*

У гісторыі захавалася шмат сведчанняў, што датычаць жыцця і дзейнасці адной з самых неднагначных асоб, звязаных з мінулым беларускіх зямель – вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Святаславіча. Дата яго нараджэння не была зафіксавана летапісцамі, магчыма, таму, што Уладзімір быў пазашлюбным сынам вялікага князя кіеўскага Святаслава Ігаравіча ад Малушы – ключніцы-рабыні маці Святаслава вялікай княгіні Вольгі. Свой першы палітычны вопыт Уладзімір атрымаў у якасці князя-намесніка Ноўгарада, куды быў пасланы паводле прапановы свайго дзядзькі Дабрыні ў 969 г. Пасля смерці Святаслава ў 972 г. паміж яго сынамі пачалася міжусобная барацьба, якая набыла жорсткія формы. У гэты час Уладзімір Святаславіч быў вымушаны ўцячы ў Скандынавію, дзе здабыў дапамогу і вярнуўся назад у Ноўгарад з атрадам варагаў. Каля 980 г. Уладзімір вырашыў здабыць кіеўскі трон. Па дарозе да Кіева ён спыніўся каля Полацка і пасватаўся да Рагнеды – дачкі полацкага князя Рагвалода. Пасля адмовы Рагнеды выйсці за яго замуж, Уладзімір Святаславіч захапіў Полацк, забіў Рагвалода, яго жонку і дваіх сыноў, а Рагнеду прымусіў стаць сваёй жонкай. Пасля гэтага Уладзімір захапіў Кіеў і забіў свайго брата – кіеўскага князя Яраполка. Адным з палітычных пачынанняў Уладзіміра была рэлігійная рэформа язычніцкага пантэона, на вяршыню якога па загаду ваяўнічага князя быў пастаўлены бог Пярун. Але патрабаваннем часу было далучэнне Кіеўскай Русі да адной з монатэістычных сусветных рэлігій. Летапісец паведаміў, што князь доўга разважаў над гэтым пытаннем. У выніку выбар быў зроблены на карысць праваслаўнага веравучэння. Гэтаму спрыяў і збег спрыяльных абставін. У 987 г. па просьбе візантыйскага імператара Васіля II Уладзімір Святаславіч дапамог задушыць паўстанне ў Візантыі пры ўмове, што сястра імператара Ганна будзе аддадзена за яго замуж. Перад заключэннем шлюбу Уладзімір Святаславіч павінен быў прыняць хрысціянства і пакінуць Херсанес (Корсунь), які ён аблажыў сваім войскам. У 988 – 989 гг. пры актыўнай падтрымцы Уладзіміра Святаславіча, які пасля хрышчэння атрымаў імя Васіль, хрысціянства стала дзяржаўнай рэлігіяй Кіеўскай Русі. Пры Уладзіміры Святаславічы Кіеўская Русь дасягнула высокага палітычнага, эканамічнага і культурнага ўзроўню: развіваліся земляробства і рамёствы, будаўніцтва, былі заснаваны школы для падрыхтоўкі служылай знаці і духавенства. Уладзімір здолеў наладзіць плённыя сувязі з Візантыяй, Балгарыяй, Польшчай, краінамі Заходняй Еўропы. Большасць беларускіх гісторыкаў пагаджаюцца з меркаваннем аб тым, што, верагодна, Уладзімір у канцы X ст. заснаваў г. Ізяслаўль (Заслаўе) на Свіслачы і назваў яго па імені Ізяслава Уладзіміравіча – свайго сына ад Рагнеды. Апошні каля 988 г. быў прызначаны па сутнасці намеснікам бацькі ў Полацкай зямлі. Памёр Уладзімір Святаславіч у 1015 г. Прыкладна ў сярэдзіне XIII ст. па прапанове князя Аляксандра Неўскага князь Уладзімір Святаславіч быў аб'яўлены праваслаўнай царквой роўнаапостальным і кананізаваны. Такім чынам, князь Уладзімір Святаславіч з'яўляўся неадназначнай асобай. Ён намеціў вялікую праграму дзяржаўных пераўтварэнняў, якую пачаў выконваць не толькі сам, але і перадаў у спадчыну нашчадкам. У народнай памяці ён застаўся шчодрым князем, якога ўслаўлялі быліны, што называлі яго “Красное Солнышко”.

*Презов Иван Александрович*, студент ФИТиУ БГУИР, prezov.ivan@gmail.com
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, заведующий кафедрой гуманитарных дисциплин, кандидат исторических наук, доцент

Библиотека БГУИР